**А.М. Нароўская (Мінск)**

# СІМВАЛІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ ДЗВЯРЭЙ І АКОН ТРАДЫЦЫЙНАГА ЖЫЛЛЯ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

Згодна этнаграфічным і фальклорным крыніцам існуе два віды сувязі дома з вонкавым асяроддзем: гэта рэгламентаваны (уваход/выхад праз дзверы) і нерэгламентаваны (праз акно, дымаход і г.д.). Усім дзеянням каля дзвярэй прыпісвалася высокая ступень семіятычнасці. Самая простая іх інтэрпрэтацыя звязана з прасторава-часавым супрацьпастаўленнем пачатак — канец знаходжання ў жыллі.

Існавала цэлая сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння дзвярных і аконных прасмаў. Згодна этнаграфічным матэрыялам, у паўночна-заходніх раёнах Віцебскай губерні, над дзвярамі і аконнымі касякамі крэйдай альбо дымам ад свечкі пісалі пачатковыя літары імён трох каралёў (К+М+В) з крыжыкамі. Адносна значэння гэтага абраду ў Браслаўскім раёне патлумачылі, што такім чынам людзі адганялі нячыстую сілу [2].

Асаблівае значэнне надавалася запорам, якія павінны былі рэгламентаваць сувязь з вонкавым светам. На ўсёй тэрыторыі Беларусі было распаўсюджана павер'е, што на «святкі» «нячыстая сіла» можа нашкодзіць людзям, а пачынаючы з купальскага кануна ведзьмы былі небяспечнымі на працягу цэлага тыдня. Асаблівую моц, па меркаванням беларусаў Віцебскай губерні, яны набывалі пасля захаду сонца. Таму існавала цэлая сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння: абломкі касы, нож або чацвярговую свечку ўтыкалі ў шчыліну парога ці касяка. У хаце развешвалі крапіву, палын, часнок.

Такім чынам, менавіта дзверы, вокны — гэта мяжа двух міроў, дзе, па меркаванню беларусаў, канцэнтруюцца злыя сілы, якія маглі пранікнуць ў жыллё і пашкодзіць чалавеку. Таму існавала цэлая сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння, якая павінна была адвесці ад чалавека пагрозу яго здароўю, дабрабыту, шчасцю.

Характэрным спосабам маркіравання пачатку (уваходу) і канца (выхаду) з'яўляецца прыпынак перад парогам хаты, які часта суправаджаецца кароткаю малітваю, асабліва пры ўваходзе ў чужы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дом. У выпадку адпраўлення ў дарогу рэгламентуюцца нават вярбальныя паводзіны. Н.Я. Нікіфароўскі адзначае, што «апошнія словы путніка да дамачадцаў могуць быць толькі перад парогам жылля ды з экіпажа. Перагаворвацца праз парог ці глядзець па кутам ён не павінен, таму што будуць шматлікія паломкі вупражы ды й экіпажа» [4, с. 121].

Вялікая роля парога і ў этыкетных сітуацыях. Так, А. Сержпутоўскі ў прымхах і забабонах беларусаў-палешукоў піша, што «ніколі не вітайся ні з кім цераз парог, бо з тым чалавекам хутка пасварышся». Калі не будзеш прытрымлівацца гэтых правілаў, могуць быць непажаданыя вынікі. Такія паводзіны зафіксаваны падчас этнаграфічных экспедыцый і ў Пастаўскім, Шаркаўшчынскім раёнах Віцебскай вобласці [3].

У абрадах прадпісанні былі абавязковымі. Згодна этнаграфічным апісанням Нікіфароўскага ў Віцебскай губерні жаніх абавязкова павінен быў прыступам ўзяць спачатку вароты, а потым і дзверы хаты маладой. А ў Барысаўскім павеце, часам жаніха пускаюць мірам, а часам дружына жаніха выбівае дзверы хаты сілаю [1, с. 156]. Асабліва паказальнымі з'яўляюцца абрады, звязаныя з парогам у радзінах і пахаванні, калі ў першым выпадку маркіруецца пачатак жыцця чалавека, асваення ім жылой прасторы, а ў другім — канец жыцця, развітанне з домам. Зыходзячы са звестак Семянтоўскага, у Віцебскай губерні «пасля хрышчэння дзіця прыносіцца ў дом бацькоў кумою; яна кладзе яго каля парога хаты, адкуль яго бярэ на рукі кум і, перадаючы маці, кажа: бралі ў Вас дзіця народжанае, а аддаём малітвяне і хрышчонае; дай Божа іцоб расло, ды й шчаслівым было» [5, с. 78]. Такім чынам «асвяшчэнне» дзіцяці праз парог павінна было яго далучыць да яго дому, прынесці шчасце.

Міфалагізацыя мяжы праяўляецца і ў рытуальных дзеяннях, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці (адмыканне ўсіх дзвярэй, у тым ліку і «царскіх врат» у царкве пры цяжкіх родах, адмыканне замкоў). Пры цяжкіх родах бабка-павітуха адчыняе ўсе дзверы. А калі жанчына доўга мучаецца, то бабка праводзіць яе тройчы праз парог.

Актуалізацыя мяжы, у прыватнасці, парогу, пры хваробах звязана з уяўленнямі аб лакалізацыі прычын хваробы па-за межамі дому. Напрыклад, пры замове валы ад болі ў жываце ставілі ваду на парог, потым насыпалі крыж накрыж соль і, перамешваючы нажом, казалі словы замовы. Пры лячэнні ад «урокаў» замоўленую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваду вылівалі на пяту дзвярэй, «каб ліха так круцілася, як крупяцца дзверы».

Як і дзверы, вокны суадносяцца з ідэяй уваходу, пранікальнасці, сувязі жылля з вонкавым светам, але ж гэта сувязь мае спецыфічны характар.

Выкарыстанне акна ў якасці такога ж ходу, як і дзверы, пранікальнасць акна для чалавека, птушак, жывёл лічылася непажаданым і небяспечным: «Ластаўка ў акно заляціць — да пакойніка», «Верабей у акно — перамена жыхарства».

Праз акно адбывалася сімвалічная сувязь са светам мёртвых: «Каб чалавеку лягчэй было паміраць, трэба прыадчыніць дзверы і вокны, а яшчэ лепей адчыніць комін, каб зрабіць дзірку, праз якую душа выходзіць». Судзячы па матэрыялах П.Я. Нікіфароўскага, «як толькі чалавек памрэ, хутчэй на вокны ставяць чаркі, або шклянкі з чыстаю вадою, каб душы было дзе пакупацца». Часам ставілі ваду на акно, і яна стаяла 40 дзён, «каб душа ў цяжкі час магла зайсці і пакупацца».

Гэта пацвярджаецца і іншымі этнаграфічнымі матэрыяламі. Так, у дзень памінавення «дзядоў» гаспадар адчыняў вокны і адтуліну ў сталі («душнік»), праз якія павінны былі прыляцець душы. Гаспадар запрашаў дзядоў са словамі: «Святыя дзяды, завём Вас, Святыя дзяды, хадзіце да нас. Ёсць тут ўсё, што Бог даў, што я для Вас ахвяраваў, чым толькі хата багата» [1, с. 596]. На вясеннія дзяды гаспадар вымятаў жыллё і выганяў такім чынам душы: «А кыш, кыш, душачка! Катора старша і больша — та дзвярыма, а катора менша — вокнама». У шэрагу рэгіёнаў, калі паміраў чалавек, вывешвалі ручнік як шлях, па якому павінна падымацца душа.

Непасрэдная сувязь акна з іншай прасторай бачна і ў забароне выліваць у адчыненае акно ваду (памоі), пляваць, выкідваць косці, кошку і іншае, таму што часта там стаіць анёл, які ў гэты час сыходзіць.

Акно — «вока» дома — звязана не толькі з тэмай смерці, але ж, што яшчэ больш важна для разумення семантыкі акна, з тэмай пранікнення за межы жылля. Такім чынам, не толькі злыя сілы могуць пранікнуць у жыллё, але ж і чалавек, знаходзячыся ў жыллі, месцы абжытым, можа пранікнуць у вонкавы свет. Характэрна, што ежа, якая падаецца ў акно, заўжды мае сакральны характар. Напрыклад, звычай класці першы блін на акно «для радзіцелей, бацькоў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такая маркіраванасць вербальнай сувязі праз акно тлумачыцца тым, што нармальным лічыцца візуальны кантакт: у вокны глядзяць, а каля дзвярэй слухаюць.

Такім чынам, вокны і дзверы мелі высокі семіатычны статус. Асаблівасць сімволікі дзвярэй і акон тлумачыцца хутчэй за ўсё тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы. Яны суадносяцца з ідэяй уваходу, пранікальнасці, сувязі жылля з вонкавым светам, адсюль існаванне сістэмы сімвалічных спосабаў ачышчэння і засцярогі ад пранікнення злых сіл у жыллё. У звычаях і абрадах беларусаў надзіраецца ўжыванне розных прынцыпаў магіі – апатрапейнай, кантактнай, якая павінна была адвесці ад чалавека пагрозу яго дабрабыту, здароўю, шчасцю.

*Літаратура і крыніцы*

1. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, собранные и приведенные в порядок П. В. Шейном [Текст]: в 3 т. / Сост. П. В. Шейн; Императорская Академия Наук, Отделение русского языка и словесности. – СПб.: Типография Императорской Академии Наук, 1890. – Т. I: Бытовая и семейная жизнь великорусса в обрядах и песнях, Ч. II. – 1890. – XXXI, 708 с.: 2 л. илл.; 4 с. нот. – (Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии Наук; том LI; № 3).
2. Матэрыялы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНП) ў Браслаўскі раён Віцебскай вобл. у 1988 г.
3. Матэрыялы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНП) ў Пастаўскі, Шаркаўшчынскі раёны Віцебскай вобл. у 1989 г.
4. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская типография, 1897.
5. Сементовский, А.М. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбах и похоронах / А.М. Сементовский // Памят. кн. Витеб. губ. на 1865 г. – СПб., 1865. – С. 76–90.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ